# ВУЧЭБНЫ РЭПЕРТУАР ЯК СРОДАК ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ДА САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***Г. А. Быстроў,***
*прафесар кафедры народна-інструментальнай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук*

Сацыяльная функцыя музычнага мастацтва ярчэй за ўсё выяўляецца ў накіраваным глыбокім уплыве на розныя сферы жыцця людзей. Для таго каб мастацкія ідэі арганічна маглі ўвайсці ў сацыяльныя структуры асобы, патрабуецца навуковае ўпраўленне культурным працэсам, а таксама вывучэнне механізмаў уздзеяння мастацкіх каштоўнасцей на духоўнае развіццё грамадства ў цэлым. Мастацтва заўсёды было і застаецца найбольш цэласным і жывым адлюстраваннем стану грамадскага жыцця. Важнейшым механізмам мастацкага ўздзеяння на якасць падрыхтоўкі студэнтаў да будучай сацыяльна-культурнай дзейнасці з'яўляецца вучэбны рэпертуар. Ад яго мэтанакіраванасці залежыць не толькі фарміраванне творчай індывідуальнасці і выканальніцкага майстэрства, маральна-эстэтычных якасцей студэнта, але і вырашэнне складаных шматпланавых задач, якія стаяць перад будучым прапагандыстам музыкі. Д. Б. Кабалеўскі падкрэсліваў, што твор, уключаны ў вучэбны рэпертуар, павінен быць мастацкім і захапляючым, педагагічна мэтазгодным (г.зн. вучыць патрэбнаму і карыснаму), павінен выконваць вызначаную выхаваўчую работу. Адпаведнае месца ў вучэбным рэпертуары павінна займаць класічная спадчына рускіх, замежных і савецкіх кампазітараў. Прынцыпова важным з'яўляецца і сам падыход да вывучэння творчасці асобных кампазітараў, які ажыццяўляецца з пазіцыі стылявых асаблівасцей асноўных этапаў развіцця сусветнай музычнай культуры. Асобую ўвагу трэба звярнуць на знаёмства з мноствам творчых школ, напрамкаў, са стылістычнай разнастайнасцю музычнага матэрыялу.

Усе недапрацоўкі ў фарміраванні ў студэнтаў мастацкага густу, духоўных інтарэсаў, умення адрозніваць добрае ад дрэннага, высакароднае і ўзвышанае ад нізкага і вульгарнага, бачыць і разумець у мастацтве не толькі прыгажосць, але і праўду жыцця адаб'юцца на іх будучай практычнай дзейнасці. Выхоўваючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнта, мы выхоўваем будучага выхавальніка соцень удзельнікаў музычных калектываў і тысяч слухачоў.

Бяда ў тым, што шмат людзей, накіроўваючы працэс прапаганды музыкі, аказваюцца дрэннымі выхавальнікамі. А кожны чалавек, незалежна ад яго пасады і звання, калі ён складае канцэртную праграму музычнага мерапрыемства, план работы дыскатэкі, арганізоўвае абмеркаванне папулярных музычных твораў, манеры выканання і выканаўцы, павінен быць выхавальнікам, таму што ён абавязкова чаму-небудзь вучыць людзей, уплывае на іх уяўленне аб жыцці, на іх светапогляд. Сучасныя студэнты, засвойваючы музычную спецыялізацыю, стануць тымі кіраўнікамі, якія сродкамі музыкі будуць выхоўваць і шліфаваць мастацкі густ і духоўны мір чалавека, зацвярджаць у разуменні асобы сацыяльна-культурныя каштоўнасці.

Выдатны піяніст і педагог Г. Г. Нейгаўз сцвярджаў, што чым шырэй у студэнта кола інтарэсаў, тым вышэй яго якасць музыканта. Нярэдка яшчэ некаторыя студэнты бачаць у музыцы толькі сродак забавы. У многіх выпадках яны аддаюць перавагу музыцы лёгкага жанру і часта іх густ фарміруецца не на лепшых яе ўзорах. Падобныя музычныя інтарэсы студэнтаў знаходзяцца ў супярэчнасці з выхаваннем іх маральна-эстэтычных зносін. У свой час Б. У. Асаф’еў выступаў катэгарычна супраць распаўсюджвання музыкі, якая зніжае этычнае стаўленне да жыцця і адводзіць ад высокіх ідэалаў мастацтва, і заклікаў даць народу «шчодрай жменяй» жамчужыны музычнай класікі.

Масіраваны наступ забаўляльнай музыкі стварае шматлікія цяжкасці ў галіне музычнага выхавання ўжо толькі тым, што ўносіць смуту ў розум падлеткаў і моладзі. Неабходна стварыць эмацыянальна-інтэлектуальную абарону для моладзі, навучыць яе адрозніваць сапраўды цудоўнае ад фальшывага, безгустоўнага.

Кампазітар – выканаўца – слухач – педагог непарыўна звязаны ў адну сістэму. Сістэма гэта і раўнавага ў ёй часта парушаюцца. Усе чатыры звёны раўназначныя. Разлад у адным з іх выклікае разлад ва ўсёй сістэме. І ўсё ж музычную творчасць трэба вылучыць як зыходную, якая ў значнай меры вызначае развіццё, змест і форму астатніх. Новыя стылі, напрамкі ў творчасці заўсёды выяўлялі новыя выканальніцкія стылі, новыя ідэі ў педагогіцы, уплывалі на эстэтычны густ і ідэалы слухачоў.

Ад таго, як мы вызначым свае адносіны да творчасці, у значнай ступені залежаць нашы адносіны да астатніх праблем. Разумець

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтыя задачы – значыць забяспечыць музычную падрыхтоўку студэнта так, каб яна выходзіла далёка за межы толькі тэхнічнай дасканаласці, рыхтаваць студэнта не толькі да выступлення на эстрадзе, але і да ўдзелу ў грамадскім жыцці, рабіць упор на шляхах устанаўлення кантактаў з аўдыторыяй, забяспечыць студэнта шырокім рэпертуарам. Калі гэта добрая таленавітая музыка і выканаўцы яе добрыя і таленавітыя, канцэрты праходзяць у перапоўненых залах.

Музычным дзеячам, педагогам трэба выхоўваць перш за ўсё разуменне сацыяльнай ролі мастацтва. Тады ў рэалізацыі сваіх наватарскіх накіраванасцей студэнт будзе цвёрда абапірацца на фундамент каштоўнасцей, створаных чалавецтвам, зможа разабрацца ў навакольным складаным музычным свеце нашых дзён. Д. Б. Кабалеўскі падкрэсліваў, што выхаванне музыканта – самая складаная галіна музычнай педагогікі. Ад правільнага вырашэння пытання залежаць і творчасць, і выканальніцтва, і педагогіка, і адносіны да музыкі слухачоў.

Такім чынам, правільны падбор вучэбнага рэпертуару з пазіцый прафесійнай значнасці і асобаснага інтарэсу студэнтаў, ідэйна-мастацкага зместу і маральна-эстэтычнай накіраванасці твораў у вялікай ступені вызначае арганізацыю будучай сацыяльна-культурнай дзейнасці студэнтаў.

1. *Асафьев, Б.* Избранные статьи о музыкальном просвещении и образовании / Б. Асафьев. – М. ; Л. : Музыка, 1965.

2. Проблемы развития системы музыкального образования / Труды ГМПИ им. Гнесиных. – М., 1987. – Вып. 87.

3. Проблемы профессионального обучения музыканта : сб. ст. – Ташкент : Изд-во лит. и искусства, 1988. – 111 с.

4. *Цыпин, Г. М.* Музыкально-исполнительское искусство : теория и практика / Г. М. Цыпин. – СПб. : Алетейя, 2001. – 318 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ